18. Directorium divini officii et missarum pro ecclestis Romano Catholicis archi-diecaesis Mohiloviensi per universum Imperium totius Russiae juxta computum veteris in annum post bissextilem primum a navitate vero domini MCCLXXXV. – Mohileviae: Typogr. IllmiE ac R. D. Archi-Epis. Mohil., 1785. – 124 s.
19. НГА Беларусі. – Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 352.
20. НГА Беларусі. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 1.
21. НГА Беларусі. – Ф. 3219. Воп. 1. Спр. 778.
22. НГА Беларусі. – Ф. 1781. Воп. 2.
23. НГА Беларусі. – Ф. 1781. Воп. 2. Спр. 2220.
24. *Марозава, С. В.* «Сваёй веры ламаць не будзем…» : супраціў дэўнізацыі ў Беларусі (1780–1839 гг.) / С. В. Марозава. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2014. – 217 с.
25. *Wereda, D.* Biskupi unickiej metropolii kijowskiej w XVIII wieku / D. Wereda. — Siedlce-Lublin: Wydawnictwo Werset, 2013. – 375 S.
26. *Лісейчыкаў, Д. В.* Святар у беларускім соцыуме. Прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. / Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск: Беларусь, 2015. – 719 с.
27. НГА Беларусі. – Ф. 3245. Воп. 5. Спр. 10.
28. Полное собрание законов Российской империи. Собрание второе: в 55 т. – СПб.: Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1830–1884.

**(Дата падачы: 27.02.2023 г.)**

*У. Я. Аўсейчык*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай, Наваполацк

*U. Auseichyk*
Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk, Novopolotsk

**УДК 392:273.2(476.5)**

## СТАРАВЕРСКІЯ АБШЧЫНЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 1960-Я – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 1980-Х ГГ.

## OLD BELIEVER COMMUNITIES OF THE VITEBSK REGION IN THE 1960S AND THE FIRST HALF OF THE 1980S

*У артыкуле прадстаўлена характарыстыка стараверскіх абшчын на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў 1960 – першай палове 1980-х гг. На аснове архіўных крыніц разгледжаны іх стан у згаданы перыяд, прааналізаваны колькасныя змены, ахарактарызаваны некаторыя дэмаграфічныя паказчыкі, выяўлены асаблівасці тэрытарыяльнага размяшчэння абшчын у паўночнай Беларусі ў 1960 – першай палове 1980-х гг. Асаблівая ўвага звернута на ўзаемаадносіны стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў з органамі савецкай улады.*
*Ключавыя словы: стараверы; рэлігійная абшчына; этна-канфесійная група; канфесія; паўночная Беларусь; Віцебская вобласць; БССР.*

*The article reviews the Old Believers' communities on the territory of Vitebsk region in 1960s and first half of the 1980s, analyzes their situation in this period on the basis of archival sources, analyzes quantitative changes, characterizes some demographic indices, reveals the*

*peculiarities of territorial distribution of communities and Old Believers' settlement in northern Belarus in 1960s and first half of the 1980s. Special attention is paid to the relations between the Old Believer religious associations and Soviet bodies.*

*Key words: Old Believers; religious community; ethno-confessional group; confession; northern Belarus; Vitebsk region; BSSR.*

Паўночная частка Беларусі з'яўляецца адным з буйнейшых рэгіёнаў кампактнага пражывання рускіх старавераў у межах краіны. На працягу больш чым трохсотгадовага перыяду на гэтых землях адбывалася фарміраванне даволі спецыфічнай этнаканфесійнай супольнасці. У межах рэгіёна вылучаюцца дзве зоны кампактнага рассялення стараветаў. Адна з іх размяшчаецца ў заходняй яго частцы, а другая ахоплівае ўсходнюю частку Віцебшчыны.

*Мэта* артыкула – ахарактарызаваць стан стараверскіх абшчын Віцебскай вобласці ў 1960–1980-я гг. Асновай для даследавання стаў комплекс архіўных крыніц. У працы выкарыстаны матэрыялы Дзяржаўнага архіву Віцебскай вобласці, Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь. *Геаграфічныя межы* даследавання будуць ахопліваюць тэрыторыю Віцебскай вобласці ў 1960–1980-х гг. Пасля ліквідацыі ў 1960 г. Маладзечанскай вобласці і далучэння яе паўночных раёнаў да Віцебскай, межы апошняй фактычна набылі сучасны выгляд.

На пачатку 1960-х гг. на тэрыторыі Віцебскай вобласці налічвалася 16 стараверскіх зарэгістраваных рэлігійных аб'яднанняў. Па іх колькасці вобласць з'яўлялася лідарам у Беларусі. На яе прыходзілася больш паловы ад усіх зарэгістраваных стараверскіх абшчын. У 1961 г. у Беларусі дзейнічала 30 зарэгістраваных стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў (29 – беспапоўцаў, 1 – папоўцаў Белакрыніцкага сагласа) [11, арк. 271]. У вобласці ўжо з гэтага часу стараверская царква становіцца другой пасля праваслаўнай па колькасці зарэгістраваных рэлігійных аб'яднанняў. Калі яшчэ ў самым пачатку 1960-х гг. колькасць каталіцкіх рэлігійных аб'яднанняў у вобласці была большай, чым стараверскіх, то ў наступныя гады сітуацыя змянілася. Згодна з данымі на 1 красавіка 1963 г. у межах Віцебскай вобласці ўжо налічвалася 58 праваслаўных рэлігійных аб'яднанняў, 14 – каталіцкіх, 16 – стараверскіх і 5 – баптысцкіх [2, с. 191].

На працягу 1960-х гг. колькасць зарэгістраваных стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў у межах Віцебскай вобласці заставалася даволі стабільнай (толькі ў канцы 1960-х гг. з рэгістрацыі былі знятыя дзве абшчыны, гл. ніжэй). Усе гэтыя абшчыны (Табліца) размяшчаліся на тэрыторыі сучасных Браслаўскага (5), Шаркаўшчынскага (3), Мёрскага (2), Пастаўскага (2), Глыбоцкага (1), Бешанковіцкага (1) раёнаў, г. Полацка (1) і г. Віцебска (1).

У канцы 1960-х гг. колькасць зарэгістраваных стараверскіх абшчын у Віцебскай вобласці скарачаецца да 14. У гэты перыяд з афіцыйнай рэгістрацыі былі знятыя абшчыны ў в. Светагорава Бешанковіцкага раёна і ў в. Мікалаюнцы Браслаўскага раёна. Светагораўская абшчына была знятая з рэгі-

страцыі 18 снежня 1968 г. [5, арк. 83, арк. 79]. У якасці прычын зняцця ўказваліся малая колькасць вернікаў, якія наведвалі храм, «слабасць» абшчыны, а таксама парушэнні святаром (духоўным настаўнікам) М. В. Карэліным заканадаўства аб культах (маленні на могілках на Тройцу, адпяванні памерлых і хрышчэнне ў хатах і інш.) [5, арк. 46, арк. 58 адв, 61 адв]. Рашэнне аб зняцці з рэгістрацыі Мікалаюнцаўскай абшчыны Віцебскі аблвыканкам прыняў 23 верасня 1969 г. [6, арк. 68]. А 20 лістапада 1969 г. Савет па справах рэлігій пры Савеце Міністраў СССР падтрымаў рашэнне Віцебскага аблвыканкама [6, арк. 73].

*Табліца*

**Зарэгістраваныя стараверскія абшчыны Віцебскай вобласці (па стану на 1961 і 1966 г.)***

| № | Цэнтр абшчыны | 1961 г. | | 1966 г. | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Колькасць вернікаў** | Колькасць святароў | Колькасць вернікаў** | Колькасць святароў |
| | Пастаўскі раён | | | | |
| 1 | в. Апідамы | 150–200 | 1 | 150 | 1 |
| 2 | в. Кукляны | 100–150 | 1 | 150 | 1 |
| | Браслаўскі раён | | | | |
| 3 | в. Відзы | 800 | 1 | 500 | 1 |
| 4 | в. Мікалаюнцы | 80 | 1 | 150 | – |
| 5 | в. Мінкавічы | 50 | 1 | 90 | 1 |
| 6 | в. Булавішкі | 500 | 1 | 300–350 | 1 |
| 7 | в. Кірыліна | 115 | 1 | 150 | 1 |
| | Мёрскі раён | | | | |
| 8 | в. Ніўнікі | 500 | 1 | 300 | 1 |
| 9 | в. Кублішчына | 200–250 | 1 | 200 | 1 |
| | Шаркаўшчынскі раён | | | | |
| 10 | в. Ракаўцы | 100 | 1 | 70–80 | 1 |
| 11 | в. Варонка | 200–230 | – | 200 | 1 |
| 12 | в. Германавічы | 200 | 1 | 80 | 1 |
| | Глыбоцкі раён | | | | |
| 13 | в. Ластавічы | 100 | 1 | 130 | 1 |
| | Полацкі раён | | | | |
| 14 | г. Полацк | 200–250 | 1 | 100 | 1 |
| | Бешанковіцкі раён | | | | |
| 15 | в. Светагорава | 150–200 | 1 | 150 | 1 |
| | Віцебскі раён | | | | |
| 16 | г. Віцебск | 1 000 | 1 | 500–600 | 1 |

* Адміністрацыйны падзел прадстаўлены па стану на сучасны перыяд

** За колькасць вернікаў, як вынікае з аналізу матэрыялаў, прадстаўлены даныя аб максімальнай колькасці прыхажанаў, якія наведалі храм у вялікія рэлігійныя святы

Складзена аўтарам на аснове: [3, арк. 256–273; 4, арк. 19–26].

Яшчэ ў пачатку 1960-х гг. з боку абласных уладаў была прадпрынята спроба зняць з рэгістрацыі Варонкаўскую абшчыну Шаркаўшчынскага раёна за «парушэнне савецкіх законаў аб культах». Пасля смерці ў 1959 г. духоўнага настаўніка новы выбраны святар не быў зарэгістраваны належным чынам і служыў без рэгістрацыі да 1961 г. У выніку рашэннем Віцебскага аблвыканкама ад 3 лістапада 1961 г. абшчына была знятая з рэгістрацыі [7, арк. 58]. Але такія працэдура і парадак зняцця не задаволіў Савет па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў СССР, які палічыў іх незаконным [7, арк. 58–64]. У 1962 г. быў зарэгістраваны ў якасці духоўнага настаўніка Варонкаўскай стараверскай абшчыны Г. Т. Зайцаў і абшчына працягнула сваю дзейнасць [7, арк. 75].

На працягу 1970–1980-х гг. колькасць зарэгістраваных стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў у Віцебскай вобласці заставалася стабільнай. У 1974 г. тут налічвалася 14 зарэгістраваных абшчын і 14 духоўных настаўнікаў [8, арк. 39]. Але ў 1975 г. дакументы сведчаць аб адсутнасці духоўнага настаўніка ў Кірылінскай абшчыне, а таму богаслужэнні не праводзіліся [9]. Аднак згодна з іншай інфармацыяй упаўнаважанага Савета па справах рэлігій па Віцебскай вобласці за 1975 г., богаслужэнні не праводзіліся з-за аварыйнасці Кірылінскага храма [2, с. 241]. У 1981 г. у межах Віцебскай вобласці налічвалася 12 зарэгістраваных духоўных настаўнікаў. Стараверскія храмы ў в. Кірыліна і в. Мінкавічы Браслаўскага раёна, як сведчаць афіцыйныя даныя, у гэты час не працавалі [10, арк. 7]. А ў 1984 г., як сведчаць архіўныя дакументы, у вобласці дзейнічала 14 зарэгістраваных стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў і 13 духоўных настаўнікаў. У Кірылінскай абшчыне па-ранейшаму багаслужэнні афіцыйна не вяліся [11, арк. 13–14].

На працягу 1960–1980-х гг. у межах Віцебскай вобласці дзейнічалі і незарэгістраваныя стараверскія абшчыны. Так, яшчэ ў 1961 г. быў праведзены ўлік рэлігійных аб'яднанняў па Віцебскай вобласці. У выніку былі выяўлены дзве незарэгістраваныя стараверскія абшчыны ў в. Лучай (сучасны Пастаўскі раён) і в. Дзедушкі Браслаўскага раёна, якія былі ўзяты пад улік. [3, арк. 264, арк. 272].

Стараверская абшчына ў в. Дзедушкі дзейнічала і ў папярэднія часы. Яе цэнтрам была в. Буеўшчына Браслаўскага раёна, дзе знаходзіўся храм. Але ў 1936 г. ён згарэў, і ў 1939 г. прыхажане пачалі будаваць новую царкву. У сувязі з пачаткам вайны дабудаваць храм не ўдалося. Пасля вайны гэты недабудаваны храм перайшоў ва ўласнасць мясцовага калгаса. Будынак быў дабудаваны калгасам і выкарыстоўваўся як зернесховішча. А таму вернікі былі вымушаны збірацца на багаслужэнні ў доме жыхара в. Дзедушкі Г. Т. Зайцава, які быў духоўным настаўнікам абшчыны. Пасля выяўлення незарэгістраванай абшчыны духоўнаму настаўніку было загадана спыніць яе «незаконную» дзейнасць [3, арк. 211–212].

Другое незарэгістраванае стараверскае рэлігійнае аб'яднанне функцыянавала у в. Лучай (на пачатку 1960-х гг. адміністрацыйна адносілася да

Глыбоцкага раёна, але ў сучасны перыяд гэта тэрыторыя Пастаўскага раёна). Яшчэ на пачатку 1960-х гг. абшчына мела асобны храм. Згодна з архіўнымі данымі, гэта абшчына дзейнічала прыкладна да 1948 г., калі духоўны настаўнік пакінуў яе. Працяглы перыяд яна не функцыянавала, але ў 1957 г. вернікі абралі сваім духоўным настаўнікам С. Е. Русалоўскага. Аднак дакументаў на афіцыйную рэгістрацыю абшчыны і духоўнага настаўніка яны не накіроўвалі. У выніку, пасля ўскрыцця «незаконнай» дзейнасці абшчыны, у 1961 г. яе праца была спынена. А ў 1963 г. Лучайскую стараверскую царкву разабралі і перадалі для рамонту школы ў в. Мікуліна (Глыбоцкі раён) [3, арк. 212–213, арк. 217; 12, арк. 32–37; 13, арк. 33, арк. 35, арк. 36].

Акрамя таго, у межах вобласці дзейнічалі яшчэ і іншыя незарэгістраваныя «групы веруючых-старавераў» ва ўсходняй частцы вобласці, якія на ўлік не браліся. Ужо з канца 1940-х гг. большасць стараверскіх абшчын гэтага рэгіёна была знята з афіцыйнай рэгістрацыі, а таму яны працягвалі дзейнасць нелегальна. Незарэгістраваныя рэлігійныя групы стараверАЎ у даследуемы перыяд фіксаваліся ў Сіроцінскім (Шумілінскім) і Чашніцкім раёнах. У справаздачах мясцовых уладаў вельмі часта адзначалася, што ніякай актыўнасці гэтыя абшчыны не праяўляюць і на маленні не збіраюцца. Такая характарыстыка, напрыклад, датычылася абшчыны ў в. Бор Чашніцкага раёна: «Брать на учет группу старообрядцев в д. Бор Дворецкого с/с нет надобности, так как в настоящее время [на 1961 г. – *А. У.*] никаких сборов там не проводится» [3, арк. 228]. Аднак у той жа час па былой Зазерыцкай абшчыне ў тым жа Чашніцкім раёне сустракаецца іншая характарыстыка. Так, згодна з данымі на той жа 1961 г., у в. Новы Двор вернікі-старавеРЫ працягвалі збірацца ў гадавыя святы ў доме былога духоўнага настаўніка Е. І. Лебедзева [3, арк. 226].

Яшчэ адна незарэгістраваная група стараверАЎ-папоўцаў Белакрыніцкага сагласа дзейнічала ў Віцебску. Яна функцыянавала легальна ў горадзе да 1932 г., калі яе знялі з рэгістрацыі. У перыяд акупацыі гэта абшчына аднавіла сваю працу і дзейнічала да 1944 г. Але пасля вайны яна не рэгістравалася і, згодна з афіцыйнай інфармацыяй, «прекратило свою деятельность». У снежні 1966 г. абшчына прадпрыняла спробу атрымаць афіцыйную рэгістрацыю. Аднак рашэннем ад 17 сакавіка 1967 г. Віцебскі аблвыканкам пастанавіў «у рэгістрацыі адмовіць» [14, арк. 4, арк. 6]. Новыя спробы па рэгістрацыі абшчыны былі прадпрыняты ў канцы 1980-х гг. Дазвол на рэгістрацыю абшчына атрымала толькі ў 1989 г. [14, арк. 8, арк. 12].

У 1960–1980-х гг. амаль усе стараверскія абшчыны Віцебскай вобласці адносіліся да беспапоўскага накірунку (за выключэннем адной незарэгістраванай абшчыны стараверАЎ-папоўцаў Белакрыніцкага сагласа ў г. Віцебску). У дакументах таго часу сустракаецца пэўная неадназначнасць у вызначэнні сагласа беспапоўскіх абшчын. Так, большасць рэлігійных аб'яднанняў ва ўсходняй частцы вобласці, як у першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі, так і ў 1960–1980-я гг. указваюцца як паморскія. Але ў заходняй

частцы вобласці шэраг беспапоўскіх абшчын часта не мелі ніякага вызначэння сагласа, што праяўлялася і ў іх афіцыйных назвах (напрыклад, «Булавишское старообрядческое общество», «Кирилинская старообрядческая община», «Апидамское религиозное общество старообрядцев безпоповского согласия»). У той жа час шэраг абшчын у заходнім рэгіёне яшчэ ў сярэдзіне 1950-х гг. адносіўся да федасееўскага сагласа. Як сведчаць крыніцы, у пасляваенны перыяд Кублішчанская абшчына ўказвалася «федасееўскай» [16, арк. 24, арк. 25]. А пры перарэгістрацыі ў 1955 г. Ніўнікаўская абшчына ўказана як «Нивнинское старообрядческое общество верующих (федосеевцев) находящееся в дер. Нивники» [17, арк. 17]. Такім чынам, у заходняй частцы вобласці яшчэ ў 1960-я гг. не адбылося канчатковага пераходу старавераскіх абшчын у паморскі саглас. На гэту іх асаблівасць звярталі ўвагу і ў афіцыйных справаздачах: «Объединения в западных районах <…> принадлежат к старообрядцам беспоповцам-поморцам-федосеевцам и у них, в отличие от беспоповцев-поморцев (восточных районов) существует обряд венчания. В предыдущие годы венчаний не было, и он по существу отжил» [18, арк. 85].




*Мал. 2.* **Карта-схема размяшчэння зарэгістраваных стараверскіх абшчын на тэрыторыі Віцебскай вобласці (сярэдзіна 1960-х гг.)**

Як вынікае з аналізу матэрыялаў, у 1960–1980-х гг. большасць стараверскіх абшчын знаходзілася ў заходняй частцы вобласці (мал. 1). Лідарам па іх колькасці па-ранейшаму заставаўся Браслаўскі раён. Паказальна, што на тэрыторыі раёна ў канцы 1970-х гг. па колькасці зарэгістраваныя стараверскія рэлігійныя аб’яднанні нават лідыравалі. Так, на 1979 г. у Браслаўскага раёне дзейнічала 9 зарэгістраваных абшчын, з іх 4 – стараверскія, 3 – каталіцкія і 2 – праваслаўныя [2, с. 252]. У гэты перыяд істотная колькасць абшчын налічвалася таксама ў межах іншых заходніх раёнаў Віцебскай вобласці (Шаркаўшчынскім, Мёрскім, Пастаўскім, Глыбоцкім). Ва ўсход-

нім рэгіёне на працягу даследуемага перыяду засталіся толькі 3 абшчыны, а пасля зняцця з рэгістрацыі Светагораўскай абшчыны – толькі 2 (у г. Полацку і г. Віцебску).

Пры даследаванні стараверскіх абшчын у 1960–1980-х гг. складаным застаецца пытанне выяўлення колькасці іх вернікаў. Афіцыйныя даныя, якія прадстаўлены ў справаздачах упаўнаважаных Савета па справах рэлігійных культаў (з 1965 г. – Савета па справах рэлігій) тых часоў, не адлюстроўваюць рэальнай сітуацыі. У першую чаргу, гэта абумоўлена адсутнасцю сістэмы дакладнага падліку колькасці вернікаў у абшчынах. За гэту колькасць, як правіла, прымалі «максимальное количество верующих, посещающих молитвенные собрания в дни больших религиозных праздников» [3, арк. 256–273]. І гэтыя даныя прадстаўлялі ў якасці агульнай колькасці старавераў. Так, згодна з матэрыяламі, у пачатку 1960-х гг. колькасць старавераў у Віцебскай вобласці склала крыху больш чым 4,7 тыс. чалавек (табліца). А ў сярэдзіне 1960-х гг. (на 1966 г.) у вобласці агульная колькасць вернікаў-старавераў складала каля 4,3 тыс. чалавек [4, арк. 39]. Хоць гэтая лічбы і прадстаўлена ў дакументах як агульная колькасць старавераў у вобласці, але яны адпавядаюць толькі афіцыйнай статыстыцы па наведванні храмаў. Так, згодна з архіўнымі дакументамі, ва ўсіх абшчынах Віцебскай вобласці ў 1962 г. на вялікія святы ў храмах было каля 4600–4800 чалавек [19, арк. 113]. А, згодна з падлікамі за 1967 і 1968 гг., колькасць прыхажанаў па Віцебскай вобласці, якія наведвалі стараверскія храмы ў нядзелю на Пасху, склала каля 4,3 тыс. (у 1967–4330, у 1968–4225) [20, арк. 11]. Але ў сваю чаргу падлікі па асобных абшчынах паказваюць іншую карціну. Так, калі падсумаваць даныя аб наведваннях па асобных абшчынах за 1966 г. (табліца), то атрымаецца лічба значна меншая, чым 4,3 тыс. – толькі каля 3,4 тыс. чалавек. Такім чынам, нават у адных і тых жа дакументах фіксуюцца істотныя разыходжанні ў вызначэнні колькасці вернікаў, якія наведвалі стараверскія храмы ў вялікія святы. Разам з тым узнікаюць сур’ёзныя пытанні і да даставернасці такіх падлікаў. Вядома, што ніякага дакладнага падліку не вялося, а колькасць вернікаў вызначалася па суб’ектыўным меркаванні прысутных на багаслужэнні.

Умоўнасць вышэйпрыведзенай статыстыкі, якая заснаваная на наведванні храмаў, праяўляецца і выніку яе супастаўлення з афіцыйнай колькасцю прыхажанаў абшчын. Так, афіцыйная статыстыка на 1961–1966 гг. па Апідамскай абшчыне Пастаўскага раёна прадстаўляе колькасць вернікаў у 150–200 чалавек (табліца). Але ў той жа час толькі ў пратаколе прысутных на паседжанні абшчыны 30.04.1967 г. указана 307 чалавек [21, арк. 65]. Згодна з вышэйпрыведзенымі афіцыйнымі данымі, абшчына ў в. Мінкавічы Браслаўскага раёна ў 1966 г. налічвала 90 чалавек (табліца). А ў 1968 г. адбылася афіцыйная зверка колькасці яе вернікаў, якіх аказалася 226 чалавек [17, арк. 35–38 адв.]. Тая ж сітуацыя характэрна і для Полацкай абшчыны. Так, згодна з данымі на 1961 г. (табліца), яна налічвала 200–250 чалавек, а на

1966 г. – толькі 100. Пры гэтым у 1960 г. быў удакладнены спіс яе вернікаў, у якім налічвалася 376 чалавек [22, арк. 48–57 адв.].

Як вынікае з аналізу дэмаграфічных даных, рэальная колькасць вернікаў была істотна большай чым дае афіцыйная статыстыка. Гэта яскрава ілюструюць наступныя прыклады. Так, Ніўнікаўскую царкву, згодна з інфармацыяй яго духоўнага настаўніка Ф. С. Войтава, наведалі ў 1962 г. каля 400–500 чалавек [17, арк. 31], што адпавядае і афіцыйным даным, прадстаўленым у Табліцы. Але пры гэтым нават у афіцыйнай справаздачы за 1955 г. колькасць вернікаў абшчыны вызначалася каля 2 тыс. чалавек [17, арк. 5]. У Варонкаўскай абшчыне Шаркаўшчынскага раёна колькасць прыхажанаў, згодна з афіцыйнымі данымі, у першай палове 1960-х гг. складала 200–230 чалавек (Табліца). Прыкладна такая ж колькасць вернікаў зафіксавана ў афіцыйным спісе абшчыны (на 1960 г. у ім адзначалася 230 чалавек) [7, арк. 62]. Але самі прыхажане вызначалі сваю колькасць значна большай – «каля 300 сямействаў» [7, арк. 64].

Такім чынам, на аснове аналізу крыніц прыходзім да наступных высноў. У межах Віцебскай вобласці ў 1960 – першай палове 1980-х гг. дзейнічала значная колькасць стараверскіх рэлігійных аб’яднанняў (на пачатку 1960-х гг. толькі зарэгістраваных абшчын было 16, а ў канцы 1960-х гг. іх колькасць скарацілася да 14). На яе тэрыторыі было сканцэнтравана больш паловы ад усіх зарэгістраваных стараверскіх абшчын Беларусі. У межах вобласці таксама дзейнічалі на працягу ўсяго перыяда шэраг незарэгістраваных абшчын і груп вернікаў. Большасць стараверскіх рэлігійных аб’яднанняў было сканцэнтравана на захадзе вобласці (асноўная колькасць у Браслаўскім, Шаркаўшчынскім, Мёрскім, Пастаўскім раёнах). У той жа час ва ўсходняй частцы рэгіёна іх было значна менш (з канца 1960-х гг. афіцыйна дзейнічалі толькі абшчыны ў г. Віцебску і г. Полацку). Нягледзячы на тое, што афіцыйная статыстыка таго часу не ў поўнай меры адлюстроўвае рэальную колькасць стараверскага насельніцтва ў рэгіёне, аднак нават з яе вынікае аб яго даволі значнай колькасці.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 952. Воп. 4. Спр. 32.
2. Православная церковь на Витебщине (1918–1991): док. и материалы / ред-кол.: М.В. Пищуленок (гл. ред.) [и др.]; сост. В.П. Коханко (отв. сост.) [и др.]. – Минск: НАРБ, 2006. – 365 с.
3. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 4029. Воп.1. Спр.13.
4. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 1.
5. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 151.
6. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 145.
7. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 139.
8. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 29.
9. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 141.
10. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 56.
11. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 68.

12. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 15.
13. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 3. Спр. 34.
14. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 152.
15. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 149.
16. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 137.
17. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 146.
18. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 4. Спр. 45.
19. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 4. Спр. 32.
20. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 8.
21. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 150.
22. ДАВВ. – Ф.1439. Воп. 3. Спр. 135.

**(Дата падачы: 05.02.2023 г.)**

*Бай Сюетун*
Белорусский государственный университет, Минск

*Bai Xuetong*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 327(510:430)2004/2020**

# ОСНОВНЫЕ НАПРАВЛЕНИЯ ГУМАНИТАРНОГО СОТРУДНИЧЕСТВА КНР И ФРГ В ЭПОХУ СТРАТЕГИЧЕСКОГО ПАРТНЕРСТВА (2004–2020 ГГ.)

# THE MAIN DIRECTIONS OF HUMANITARIAN COOPERATION BETWEEN CHINA AND GERMANY IN THE ERA OF STRATEGIC PARTNERSHIP (2004–2020)

*Статья посвящена исследованию гуманитарного сотрудничества КНР и ФРГ в 2004–2020 гг. На основе анализа широкого круга источников определены приоритетные направления и формы китайско-германского гуманитарного обмена, рассмотрены основные механизмы их реализации, проанализирована их роль и значение в комплексе китайско-германских отношений. Отдельное внимание уделено выявлению проблемных аспектов гуманитарного диалога. Сделан вывод о том, что обмены и сотрудничество в гуманитарной сфере стали одной из ключевых составляющих стратегического партнерства между КНР и ФРГ в рассматриваемый период.*

*Ключевые слова: гуманитарное сотрудничество; КНР; ФРГ; стратегическое партнерство; китайско-германские отношения.*

*The article examines humanitarian cooperation between china and germany from 2004 to 2020. the priority areas and forms of sino-german humanitarian cooperation are identified, the main mechanisms for their implementation are studied, and their role and significance in the comprehensive system of sino-german relations are examined. a special emphasis is placed on identifying the problematic aspects of the humanitarian dialogue. during the period under consideration, humanitarian exchanges and cooperation have become one of the main components of the sino-german strategic partnership.*

*Key words: humanitarian cooperation; China; Germany; strategic partnership; sino-german relations.*